Добрая навіна

ДЛЯ АХОВЫ ДУБОЎ-ВОЛАТАЎ

У Старым Раматове адкрылі новае лясніцтва

У Пажэжынскім лясніцтве на мінулым тыдні адбылася прыкметная падзея — у строй увялі новы аб'ект. Такім чынам лясніцтва справіла навасселле, а вёска Старое Раматова набыла сучаснае офіснае памяшканне і прасторны ўчастак узору сучаснага добраўпарадкавання.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Сяргей КАСЫНЮК.

— Для Маларыцкага лясгаса гэта падзея планавая, — сказаў карэспандэнту «Звязды» яго **дырэктар Аляксандр ЗЯЛЁНКА.** — Сваім работнікам стараемся забяспечваць добрыя ўмовы працы. Летась, напрыклад, новы адміністрацыйны будынак быў узведзены для суседняга Велікарыцкага лясніцтва. А ў Старым Раматове лясніцтва мяркуецца зрабіць своеасаблівым цэнтрам прафарыентацыйнай і асветніцкай работы. Тут будуць праходзіць экскурсіі для моладзі і школьнікаў, дзе юным наведвальнікам раскажуць аб прафесіі лесавода, пакажуць шмат чаго цікавага.

А паказаць у Пажэжынскім лясніцтве ёсць што. Менавіта тут знаходзіцца знакаміты цар-дуб узростам больш за 800 гадоў, помнік прыроды рэспубліканскага значэння. Гэты дуб лічыцца самым старым у Беларусі. Ён такі не адзін, літаральна за некалькі кіламетраў ад яго расце дуб-патрыярх «Пажэжынскі». Гэты дуб, паводле ацэнкі спецыялістаў, на сто гадоў маладзейшы за старэйшага «брата». Мае вышыню каля сарака метраў, дыяметр ствала каля двух метраў. У цара-дуба названыя параметры яшчэ большыя. Да гэтых волатаў пастаянна едуць на экскурсію падарожнікі. Побач ёсць інфармацыйныя стэнды, але ж цікавей, вядома, калі экскурсію правядзе спецыяліст.

Таксама лесаводам ёсць што расказаць пра сваю работу. Лес — адно з асноўных прыродных багацяў раёна. Расказваюць, што неаднойчы тыя, каму ўдавалася самалётам пралятаць над Маларытай, параўноўвалі невялікі райцэнтр з санаторыем. Горад так выглядае, бо размешчаны спрэс у лясах. На мове лічбаў гэта выходзіць такім чынам: пад лясным масівам занятыя 680 квадратных кіламетраў, а плошча, пакрытая лесам, налічвае больш за дзевяць тысяч гектараў. Так што работы пажэжынскім леснікам хапае. А **галоўны ляснічы Брэсцкага лесагаспадарчага аб'яднання Аляксандр МАЦЮШЭЎСКІ**, які прыехаў павіншаваць калег з навасяллем, адзначыў у якасці станоўчага фактару пастаянную аўтаматызацыю тэхналагічных працэсаў у Маларыцкім лясгасе. Сведчаннем дынамічнага развіцця галіны, паводле яго слоў, становіцца няспынны ўвод у эксплуатацыю новых аб'ектаў. Напрыклад, зусім нядаўна Баранавіцкі лясгас адкрыў новы цэх па распілоўцы лесу, на Пружаншчыне пабудавалі пелетны завод, які ўжо дае прадукцыю, на падыходзе іншыя аб'екты.

І хоць асобнае лясніцтва — не такі вялікі па значнасці аб'ект, але для канкрэтнага калектыву ды і для вёскі ў цэлым гэта, несумненна, падзея. Будынак узводзілі спецыялісты Маларыцкай ПМК-20. І новабудоўля ўпрыгожыла Старое Раматова. Памяшканне атрымалася прасторным і светлым, кабінеты абсталяваны камп'ютарнай тэхнікай, ёсць усё неабходнае для паспяховай работы. А элементы добраўпарадкавання сталі не толькі прыкладам для навакольных, але і своеасаблівай рэкламай прадукцыі. Па перыметры ўчастка высаджаны туі, якія паспяхова вырошчваюць у гадавальніках лясгаса.

Галоўны ляснічы Пажэжынскага лясніцтва Сяргей КАСЫНЮК сказаў, што былое памяшканне лясніцтва, якое размешчана побач з новым, можа быць выкарыстана ў далейшым у якасці службовага жылля.

— Некаторыя ў нашым калектыве могуць прэтэндаваць на званне ветэранаў галіны, сам, напрыклад, працую 31 год, бухгалтар Валянціна Мартысюк — 38 гадоў, але ж прыязджаюць і маладыя спецыялісты, — зазначае Сяргей Сяргеевіч. — Напрыклад, сёлета па размеркаванні да нас прыбыла памочнік ляснічага Анастасія Струнец. Пакуль што дзяўчына дабіраецца на работу за 10 кіламетраў. Патрэба ў службовым жыллі ёсць. У цэлым жа калектыў у нас дружны, працаздольны. Гэтым летам шмат давялося працаваць на ліквідацыі наступстваў урагану, які абрынуўся на нас 6 ліпеня. Зараз на парадку дня звычайныя лясныя клопаты, — заўважыў ляснічы.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
Маларыцкі раён.

ЗІМА СПЫТАЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— На праводку трэба звяртаць асаблівую ўвагу, калі яна ў вас працуе яшчэ з савецкай эпохі, — адзначыў суразмоўнік. — За гэты час тэрмін яе эксплуатацыі ўжо скончыўся. Да таго ж сучасныя нагрузкі на электрычнае абсталяванне куды вышэйшыя, чым у 80-я гады ці нават раней. Самы яркі індыкатар, што нешта не так, — гэта калі спрацоўвае аўтамат і памяшканне застаецца без святла. Значыць, недзе адбываецца кароткае замыканне. Але яно можа адбыцца і не з прычыны істотнага зносу праводкі. Прыборы з вялікай магутнасцю — пральныя машыны, электрычныя абагравальнікі ды і тыя ж камп'ютары — нярэдка ўключаюцца ў агульную разетку. А павінны ў асобную.

Цікава, што пажары, у якіх «замешаны» самаробныя электрычныя абагравальнікі, амаль сышлі ў гісторыю. У тым жа 2019-м іх было ўсяго два. Але і вынік пажараў трагічны: загінулі тры чалавекі. У жылым доме ў вёсцы Ніканавічы Быхаўскага раёна прычынай пажару стаў самаробны цеплаэлектранагравальнік. Ратавальнікі знайшлі целы двух чалавек. А ў вёсцы Дубрава Дзяржынскага раёна загарэўся абагравальнік кустарнай вытворчасці, праз што загінуў гаспадар дома. Пры гэтым на долю абагравальных прылад, выпушчаных прамысловымі вытворцамі, прыйшлося 33 пажары. Аднак толькі ў пяці выпадках прычынай стаў заводскі брак. Рэшта — праз няправільную эксплуатацыю.

Акрамя таго, трэба зважаць на тэрмін эксплуатацыі агрэгата, прапісаны ў інструкцыі заводам-вытворцам. Часцей за ўсё гаворка ў ёй ідзе пра дзесяць гадоў. У больш старых мадэлях можа быць рэгламентавана і пятнаццаць гадоў службы, але калі прылады былі выпушчаны раней за 2005 год, то час іх службы ўжо натуральным чынам скончыўся.

Тэрмін эксплуатацыі азначае, што падчас яго вытворца са свайго боку нясе адказнасць за яго работу, калі з боку карыстальніка няма ніякіх парушэнняў. Але тэндэнцыя апошніх дзесяцігоддзяў у тым, што пры вытворчасці тэхнікі ўсё часцей выкарыстоўваюцца бюджэтныя кампаненты. З аднаго боку, гэта змяншае кошт прылады. Але з іншага — памяншаецца і час яе работы. Так, аўтаматыка ў новых мадэлях заточана пад тое, каб спрацоўваць на аварыйны рэжым. Але толькі на яе спадзявацца не выпадае.

Абагравальнік пажадана ставіць пасярод пакоя, каб ён не датыкаўся да іншых рэчаў — фіранак, вопраткі, коўдраў, — раіць Віталь Навіцкі. — Не зашкодзіць і вогнетушыцель. Для жылога пакоя найлепшы яго аб'ём — ад пяці літраў і болей. Толькі ставіць яго трэба ў тым месцы, куды можна дабрацца за лічаныя крокі. А вось з дзецьмі вельмі пажадана правесці своеасаблівыя вучэнні ў гульнявой форме, каб яны ведалі, што рабіць пры няштатнай сітуацыі ў доме.

Але і пажары праз няправільную эксплуатацыю печак — зусім нярэдкія ў Беларусі. Так, год ад году колькасць дамоў з такім ацяпленнем з натуральных прычын скарачаецца — у пераважнай большасці новых пабудоў манціруюцца больш бяспечныя катлы. Але і печы рана спісваць у запас — прынамсі, пэўны час яны па-ранейшаму будуць грэць людзей, асабліва сталага веку.

Самая простая дыягностыка — гэта пабяліць печку ў белы колер і прапаліць яе. Калі недзе з'явяцца чорныя

сляды — такую печ трэба неадкладна рамантаваць, бо гэта азначае, што чадны газ ідзе ў пакой. Газ гэты не мае ні колеру, ні паху. Выпадкі атручэння ім часцей за ўсё рэгіструюцца ў начны час, калі чалавек спіць...

Таксама трэба падняцца на гарышча і расчысціць усю прастору вакол коміна. Былі выпадкі, калі пажары ўзнікалі з-за таго, што смецце на гарышчы датыкалася да моцна напаленых цаглін коміна. Калісьці наступаў крытычны момант — і папера або вопратка пачынала тлець...

Таму дапамажыце сваім сваякам, якія жывуць у прыватных дамах, падрыхтавацца да зімы належным чынам, — заклікаў Віталь Навіцкі. — Што ж да тых, хто жыве адзін, то ў кастрычніку да іх завітаюць прадстаўнікі розных ведамстваў — Мінэнерга, Мінжылкамунгаса, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Праўда, нярэдка мы чуем ад гаспадароў дамоў, што яны справяцца з праблемамі самі. Таму заклікаем не саромецца папрасіць нешта зрабіць нас. Гэта робіцца дзеля вашай жа бяспекі.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

8 октября 2020 года на 18-м открытом аукционе проводит 13-й от 20 августа 2020 года повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Номер лота	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
129	Гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное) ш. 108205011, дв. 752240 1982 г. *4 кат. 1808 км*	н. п. Станьково филиал, в/ч 25819	54 000,00	10 800,00
130	Гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное) ш. 108409005, дв. 886928, 1984 г., *4 кат., 4652 км*	н. п. Станьково филиал, в/ч 25819	50 000,00	10 000,00
131	Гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное) ш.108205024, дв. 750243, 1982 г., *4 кат., 2932 км*	н. п. Станьково филиал, в/ч 25819	50 000,00	10 000,00

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **8 октября 2020 г. в 10.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **15.00 5 октября 2020 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **8 октября 2020 г. с 9.00 до 9.45.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3-х банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»:
белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС. Справки по тел./факс (017) 398 05 41.

Ранее опубликованные извещения в газете «Звязда» № 141 от 23 июля 2020 г., № 184 от 22.09.2020 г.

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

информирует о проведении 21.10.2020 повторного открытого аукциона (цена снижена на 40 %) по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Компания «МогНат»

Лот № 1: капитальное строение с инв. № 700/С-68770 – котельная, пл. – 687,6 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-68772 – мазутонасосная**, пл. – 41,0 кв. м. **Капитальное строение с инв. № 700/С-91634 – склад**, пл. – 44,2 кв. м. **Емкость металлическая 80 м³,** инв. № 1099304. **Участок наружной канализации протяженностью 137,1 м** (инвентарный № 700/С-90642). **Участок наружного водопровода протяженностью 37,2 м** (инвентарный № 700/С-90643).

Лот № 1 расположен по адресу: г. Могилев, ул. Островского, 64, на земельном участке с кадастровым номером 740100000005005430 (пл. – 0,4562 га). Отдельный земельный участок под обслуживание лота не выделен.

Начальная цена продажи: 91 922,40 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 9 192,24 бел. руб.

Аукцион состоится 21 октября 2020 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона **ino.by**. Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 28.03.2020, 22.05.2020, 13.06.2020.

Организатор аукциона: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 351, 352, **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by**